# ДЗЕЙНАСЦЬ ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ ПАВІННА БЫЦЬ ШМАТПЛАНАВАЙ

Акрамя таго, старшыні Парламенцкага Сходу Саюзнай дзяржавы Вячаславу Віктаравічу Валодзіну накіравана пазіцыя Савета Рэспублікі, якая датычыцца выкарыстання сродкаў бюджэту Саюзнай дзяржавы. У частцы, напрыклад, прамысловай палітыкі, стварэння сумесных кампаній.

Паважаныя калегі!

Савет Рэспублікі ў перыяд другой сесіі ўхваліў 34 праекты законаў, прыняў да ведама 1 дэкрэт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Ухваленыя членамі Савета Рэспублікі законапраекты ў сацыяльнай сферы дазволілі спрасціць працэдуры размяшчэння дзяржаўнага сацыяльнага заказу і правядзення конкурсу на яго выкананне, а таксама пашырыць формы сацыяльнага абслугоўвання.

Спрыяльна адаб'юцца на даступнасці і якасці аказання насельніцтву юрыдычнай дапамогі папраўкі ў Закон «Аб адвакатуры і адвакацкай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь».

Ратыфікаваны пагадненне аб пазыцы з Міжнародным банкам рэканструкцыі і развіцця і крэдытнае пагадненне з Еўрапейскім банкам рэканструкцыі і развіцця, міжурадавыя дагаворы з Расіяй, Аргенцінай, Чылі, Пакістанам, Турцыяй і шэрагам іншых краін.

Зроблена нямала. Але да восеньскай сесіі трэба будзе вырашыць шмат адказных задач па дадатковых мерах па забеспячэнні эканамічнай бяспекі і сацыяльнай стабільнасці.

Важна, каб да законаў, што прымаюцца, была сацыяльная лаяльнасць, каб яны адпавядалі жаданням грамадства. Пры фарміраванні плана падрыхтоўкі законапраектаў на 2018 год намі прапанавана ўключыць у яго законы, якія адпавядаюць названым мэтам. Гэта законапраекты аб электраэнергетыцы, аб карэкціроўцы законаў аб падтрымцы малога і сярэдняга прадпрымальніцтва, аб абыходжанні з адходамі, аб рэкламе, аб адміністрацыйных правапарушэннях у сферы антыманапольнага рэгулявання і многае іншае.

У цяперашні час Савет Рэспублікі па даручэнні Прэзідэнта краіны завяршае падрыхтоўку праекта Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб аўтарскім праве і сумежных правах». Ёсць тут цэлы шэраг спрэчных пытанняў, якія трэба зняць у найбліжэйшы час. У кастрычніку гэты праект Закона будзе ўнесены ў Палату прадстаўнікоў.

Наперадзе — сур'ёзная палітычная кампанія па выбарах у мясцовыя Саветы дэпутатаў новага склікання. Поспех выбарчай кампаніі ў значнай ступені залежыць ад дакладнай і зладжанай работы органаў мясцовага кіравання і самакіравання, з якімі Савет Рэспублікі знаходзіцца ў цесным дзелавым кантакце.

Члены Савета Рэспублікі павінны садзейнічаць таму, каб выбары прайшлі арганізавана і ў строгай адпаведнасці з выбарчым заканадаўствам.

Паважаныя калегі!

У красавіку 2017 года адбыўся візіт у Беларусь парламенцкай дэлегацыі Кітайскай Народнай Рэспублікі на чале са старшынёй Пастаяннага камітэта Усекітайскага сходу народных прадстаўнікоў Чжан Дэцзянам. Мы дасягнулі канкрэтных дамоўленасцяў аб паглыбленні палітычнага дыялогу, міжпарламенцкага супрацоўніцтва, рэалізацыі сумесных праектаў. Была падпісана сумесная заява аб супрацоўніцтве паміж беларускім і кітайскім парламентамі. У чэрвені з візітам у Латвіі была намеснік старшыні Савета Рэспублікі М.А. Шчоткіна. Мяркуем, што праведзеныя парламенцкія сустрэчы і кантакты з урадавымі структурамі Латвіі, як дзяржавы — суседкі і сябра ЕС адкрываюць новыя перспектывы ў беларуска-латвійскім супрацоўніцтве.

Члены Савета Рэспублікі ў чэрвені прынялі ўдзел у Мінску ў пяцьдзясят другой сесіі Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі і звязаных з ёй мерапрыемствах. Нашы прадстаўнікі адстойвалі прапановы па збліжэнні заканадаўства нашых краін, рэалізацыі праграм Саюзнай дзяржавы. Падпісаны Мемарандум аб супрацоўніцтве паміж Сакратарыятам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і Сакратарыятам Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі.

Наш удзел у мерапрыемствах Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў (МПА СНД) і Парламенцкай Асамблеі Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы (ПА АДКБ) у Санкт-Пецярбургу быў актыўным і выніковым.

22 мая ў Мінску адбылося пасяджэнне Бюро Канферэнцыі мясцовых і рэгіянальных улад краін Усходняга партнёрства (КОРЛІП), якое рыхтаваў і фактычна правёў Савет Рэспублікі. У ходзе пасяджэння былі абмеркаваны асноўныя палажэнні рэкамендацый да пятага саміту Усходняга партнёрства, якія прадугледжваюць вызначэнне канкрэтных задач у галіне эканамічнага супрацоўніцтва, развіцця інфраструктуры і міжрэгіянальнага ўзаемадзеяння. Асобная ўвага ўдзелена ролі мясцовых і рэгіянальных улад у забеспячэнні энергаэфектыўнасці.

Савет Рэспублікі садзейнічаў арганізацыі і 30 мая праведзена ў Мінску пасяджэнне Парламенцкага камітэта краін Цэнтральна-Еўрапейскай Ініцыятывы (ЦЕІ). Парламенцкія дэлегацыі 12 дзяржаў прынялі падагульняючы дакумент і ўзгаднілі новую рэдакцыю шэрагу артыкулаў Кіруючых прынцыпаў ЦЕІ. Восенню 2017 года ў Мінску плануецца пасяджэнне Парламенцкай асамблеі ЦЕІ, работа па падрыхтоўцы якога ўжо пачалася.

29—30 чэрвеня ў Маскве пройдзе чацвёрты Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі, удзел у якім прымуць кіраўнікі дзвюх нашых дзяржаў. Пройдуць пленарнае і секцыйныя пасяджэнні, выстава і кірмаш-продаж беларускіх тавараў. Плануецца заключыць пакет камерцыйных экспартных кантрактаў прыкладна на суму больш за 300 млн долараў ЗША, каля трох дзясяткаў пагадненняў аб рэгіянальным супрацоўніцтве. Правядзенне форумаў ужо стала добрай традыцыяй, дае значны гуманітарны і эканамічны эфект. І ў першую чаргу рост беларускага экспарту.

З 5 па 9 ліпеня ў Мінску адбудзецца 26-я сесія ПА АБСЕ і звязаныя з ёй мерапрыемствы, у якіх прымуць удзел парламентарыі з 53 дзяржаў. Асноўная тэма сесіі — «Умацаванне ўзаемнага даверу і супрацоўніцтва ў імя міру і працвітання ў рэгіёне АБСЕ».

Паважаныя члены Савета Рэспублікі!

У міжсесійны перыяд варта засяродзіцца на вырашэнні задач, якія спрыяюць дынамічнаму сацыяльна-эканамічнаму развіццю краіны.

Важнай уяўляецца падрыхтоўка асноўнага фінансавага дакумента краіны — Закона Рэспублікі Беларусь «Аб рэспубліканскім бюджэце на 2018 год», а таксама законапраектаў, якія ўдасканальваюць падатковую сістэму і ўпарадкоўваюць бюджэтныя адносіны.

Таксама наперадзе работа над законапраектамі, скіраванымі на карэкціроўку нормаў Банкаўскага кодэкса Рэспублікі Беларусь, законаў «Аб неплацежаздольнасці і банкруцтве», «Аб абароне правоў спажыўцоў». У перспектыве — работа па карэкціроўцы законаў «Аб інвестыцыях», «Аб прыватызацыі дзяржаўнай маёмасці і пераўтварэнні дзяржаўных унітарных прадпрыемстваў у адкрытыя акцыянерныя таварыствы» і шэрагу іншых.

Нам, членам Савета Рэспублікі, неабходна больш актыўна працаваць у рэгіёнах, у працоўных калектывах, сустракацца з людзьмі, выступаць у сродках масавай інфармацыі. Важна своечасова інфармаваць насельніцтва аб рабоце, якая праводзіцца Саветам Рэспублікі па ключавых пытаннях жыццядзейнасці дзяржавы і грамадства. Удзяліце асаблівую ўвагу занятасці насельніцтва, падтрымцы моладзі і сем'яў з дзецьмі.

Карыстаючыся магчымасцю, хачу павіншаваць вас, паважаныя члены Савета Рэспублікі, з надыходзячым галоўным дзяржаўным святам — Днём незалежнасці (Днём Рэспублікі) і пажадаць усім добрага здароўя і поспехаў у прафесійнай дзейнасці.

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

# У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ — ЭКАНОМІКА І САЦЫЯЛЬНАЯ СТАБІЛЬНАСЦЬ

Пастаянныя камісіі прадаўжаюць працаваць над законапраектамі, прызначанымі ўмацаваць пазіцыі банкаўскага сектара, аптымізаваць сістэму дзяржаўных закупак, павысіць ролю прыватнай ініцыятывы ў рэалізацыі інфраструктурных праектаў, узмацніць антыманапольную палітыку. Падрыхтавана некалькі дэпутацкіх ініцыятыў, накіраваных на паляпшэнне інвестыцыйнага клімату.

Гэта работа праводзіцца ў максімальна адкрытым фармаце.

І згаданыя вышэй, і многія іншыя не менш значныя пытанні сталі прадметам сур'ёзных публічных дыскусій, праведзеных дэпутатамі. Эфектыўнасць расходавання дзяржаўных сродкаў, прамысловая і энергетычная бяспека, сацыяльная абарона грамадзян у чарнобыльскіх раёнах, надзённыя праблемы адукацыі, асаблівасці бюджэтнага працэсу — вось далёка не поўны пералік тэм, якія выносіліся на шырокае грамадскае абмеркаванне.

Апошняе пытанне асабліва актуальна з улікам таго, што ва ўрадзе сёння актыўна абмяркоўваюцца асноўныя напрамкі бюджэтна-фінансавай і падатковай палітыкі на чарговы год. Парламентарыі таксама ўдзельнічаюць у гэтай рабоце. У нас ёсць дакладнае разуменне, што сацыяльна-эканамічны прагноз павінен быць рэалістычным, а ўкладзеныя ў эканоміку рэсурсы — прыносіць максімальную аддачу. У гэтых мэтах праведзены дэталёвы аналіз вынікаў выканання рэспубліканскага бюджэту і бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў за 2016 год. Яго вынікі стануць зыходнай кропкай для фарміравання нашых прапаноў па праекце галоўнага фінансавага дакумента краіны.

Сярод законапраектаў сацыяльнага блока, прынятых на сесіі, трэба асабліва адзначыць новую рэдакцыю Закона «Аб дзяржаўных дапамогах сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей». Яго нормы дадуць магчымасць павысіць памер асобных дапамог і павялічаць колькасць грамадзян, якія маюць права іх атрымліваць. Дзякуючы папраўкам, унесеным у Закон «Аб сацыяльным абслугоўванні», стане прасцейшай працэдура размяшчэння дзяржаўнага сацыяльнага заказу, пашырацца магчымасці ў аказанні дапамогі людзям, якія знаходзяцца ў цяжкай жыццёвай сітуацыі. Сур'ёзная работа праведзена і па абнаўленні заканадаўства ў сферах аховы здароўя, фізкультуры і спорту.

Своечасова вырашаны шэраг прынцыповых пытанняў умацавання абараназдольнасці краіны, абароны дзяржаўных сакрэтаў, барацьбы з тэрарызмам і ўдасканалення сістэмы аховы грамадскага парадку.

Даволі важкія вынікі прынесла рэалізацыя міжнароднай праграмы Палаты прадстаўнікоў. Дэпутаты прынялі актыўны ўдзел у планавых мерапрыемствах па лініі міжнародных структур, уключаючы Парламенцкі сход Саюза Беларусі і Расіі, Парламенцкую асамблею АДКБ, Парламенцкае вымярэнне Цэнтральна-Еўрапейскай ініцыятывы.

Цалкам зразумела, што асаблівую ўвагу мы засяродзілі на падрыхтоўцы 26-й штогадовай сесіі Парламенцкай асамблеі АБСЕ, якая стартуе ў г. Мінску практычна праз тыдзень. Беларусь упершыню прымае ў сябе такі значны форум. Парламенту і зацікаўленым дзяржаўным органам давялося вырашыць нямала складаных арганізацыйных праблем. Работа, праведзеная ў цесным кантакце з Міжнародным сакратарыятам ПА АБСЕ, дае магчымасць спадзявацца, што Беларусь пацвердзіць сваю рэпутацыю надзейнай дыялогавай пляцоўкі для абмеркавання самых важных пытанняў міжнароднага парадку дня.

Вынікам сесіі ПА АБСЕ стане прыняцце дакументаў, якія адлюстроўваюць рэакцыю міжнароднай супольнасці на трывожныя тэндэнцыі сучаснасці. Беларусь таксама падрыхтавала праект рэзалюцыі, у якой прапануюцца меры па ўзмацненні барацьбы са з'яўленнем новых псіхаактыўных рэчываў. Яна атрымала ўжо вялікую падтрымку нашых замежных калег, і мы разлічваем на яе паспяховае пашырэнне.

Не сакрэт, што магчымасці гэтага форуму мы імкнёмся выкарыстоўваць і для ўмацавання нашых эканамічных пазіцый на міжнароднай арэне. У вядомай ступені вырашэнню гэтай задачы практычна поўнасцю падпарадкавана ўся парламенцкая дыпламатыя.

У рамках старшынства Беларусі ў Цэнтральна-Еўрапейскай ініцыятыве дэпутаты прынялі актыўны ўдзел у пасяджэнні Парламенцкага камітэта Парламенцкага вымярэння ЦЕІ. Прадстаўнікі 12 еўрапейскіх дзяржаў абмяняліся ў г. Мінску вопытам у галінах эканомікі, укаранення інтэлектуальных тэхналогій, развіцця чалавечага капіталу.

Эканоміка была ў цэнтры ўвагі і пры абмеркаванні пытанняў саюзнага будаўніцтва. 15 чэрвеня ў г. Мінску прайшла 52-я сесія Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі. Яе вынікам сталі прапановы па ўдасканаленні падрыхтоўкі дакументаў, якія вызначаюць прыярытэты развіцця Саюзнай дзяржавы. Шэраг рэкамендацый накіраваны на паскарэнне працэдур прыняцця, укаранення ў вытворчасць і павышэнне ўзроўню камерцыялізацыі саюзных праграм. Вызначаны таксама перспектывы збліжэння заканадаўства ў розных сферах, уключаючы забеспячэнне аднолькавых правоў грамадзян Беларусі і Расіі.

У перыяд сесіі сур'ёзна актывізаваліся і нашы двухбаковыя кантакты. Умацаванне адносін абмяркоўвалася з партнёрамі з Ізраіля, Кітая, Італіі, Пакістана, Польшчы, Тайланда, Эстоніі. У Нацыянальным сходзе створаны групы па супрацоўніцтве з парламентамі Егіпта і Судана.

Да знакавых падзей сесіі трэба аднесці афіцыйны візіт у Беларусь кітайскай парламенцкай дэлегацыі на чале са старшынёй Пастаяннага камітэта Усекітайскага сходу народных прадстаўнікоў Чжан Дэцзянам. У ходзе візіту была падпісана сумесная заява, у якой вызначаны далейшыя крокі па развіцці сувязей і ўмацаванні ўзаемадзеяння ў міжнародных парламенцкіх арганізацыях.

Атрымаў развіццё і наш дыялог з Пакістанам. Двухбаковая прававая база папоўнілася двума новымі дакументамі. У рамках нядаўняга візіту ў гэту краіну беларуская дэлегацыя правяла плённыя перагаворы і сустрэчы. Адбыўся першы беларуска-пакістанскі сельскагаспадарчы форум, дзе была праведзена прэзентацыя нашай мяса-малочнай прадукцыі і абмеркавана магчымасць будаўніцтва ў Пакістане некалькіх прадпрыемстваў па перапрацоўцы сельгаспрадукцыі з выкарыстаннем беларускіх тэхналогій.

Прадоўжылася актыўная работа і на лацінаамерыканскім напрамку. Наведваючы Эквадор, мы таксама гаварылі з Прэзідэнтам і старшынёй парламента гэтай краіны аб перспектывах супрацоўніцтва ў сферы сельскай гаспадаркі. А праз некаторы час эквадорскія парламентарыі спецыяльна прыбылі ў Беларусь, каб вывучыць магчымасці нашага аграпрамысловага комплексу.

У другім паўгоддзі дынаміка міжнародных кантактаў і сустрэч будзе нарастаць. Ужо ў рамках 26-й сесіі ПА АБСЕ трэба будзе рэалізаваць даволі шчыльны графік сустрэч і перагавораў з замежнымі палітыкамі. Прадоўжыцца сістэмная работа ў фармаце міжнародных парламенцкіх арганізацый. У бліжэйшы час чакаюцца візіты ў нашу краіну кіраўнікоў парламентаў Грузіі, Індыі, Малдовы, Пакістана і Судана. Мы плануем прыняць удзел у чацвёртым Форуме рэгіёнаў Беларусі і Расіі, а таксама наведаць Арменію, Польшчу і Румынію.

Паважаныя дэпутаты!

Галоўнымі крытэрыямі ацэнкі рашэнняў, прынятых па ўсіх напрамках парламенцкай дзейнасці, былі і застаюцца бяспека, дабрабыт, упэўненасць у будучым нашых грамадзян. Але задачы, якія паўстаюць перад краінай, пастаянна ўскладняюцца. Вырашаць іх паспяхова можна толькі салідарнымі намаганнямі дзяржавы і грамадства.

Ад умення парламентарыяў весці прамы і адкрыты грамадскі дыялог па ўсіх злабадзённых пытаннях шмат у чым залежыць давер народа да ўлады, а значыць, і захаванне сацыяльнай стабільнасці як важнейшай умовы дынамічнага развіцця.

Нашы прыярытэты ў выбарчых акругах дакладна вызначаны. Галоўныя з іх — занятасць, новыя рабочыя месцы, падтрымка слабаабароненых слаёў насельніцтва. Выпрацоўка канкрэтных прапаноў па ўсіх гэтых пазіцыях — прамое даручэнне кіраўніка дзяржавы. Каб прапанаваныя меры былі зразумелымі і абгрунтаванымі, важна знайсці агульную мову з мясцовымі ўладамі, структурамі грамадзянскай супольнасці, працоўнымі калектывамі. Толькі так можна забяспечыць баланс інтарэсаў. А гэта сёння самае галоўнае.

На заканчэнне, паважаныя калегі, хачу падзякаваць вам за праведзеную работу і павіншаваць усіх прысутных з надыходзячым святам — Днём Незалежнасці Рэспублікі Беларусь.

Жадаю вам моцнага здароўя, шчасця і новых здзяйсненняў на карысць Радзімы.

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*